*І. Забаўская, М. Забаўскі*
*(Мінск)*

# ДЭПУТАТЫ-ПАЛЯКІ АД МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ЦАРСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ ПЕРШАГА СКЛІКАННЯ (27.4(10.5)–8(21).7.1906)

Першая расійская рэвалюцыя прымусіла царызм шукаць шляхі «супакаення» краіны. Гэтай мэце служыла Дзяржаўная дума, пры дапамозе якой урад планаваў папярэдзіць новы магчымы выбух рэвалюцыі і вырашыць галоўныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця краіны: аграрнае, нацыянальнае, рабочае і інш., захоўваючы непахісным памешчыцкае землеўладанне і дапускаючы да ўлады гандлёва-прамысловую буржуазію.

Выбарчая кампанія ў І Дзяржаўную думу выклікала шырокі грамадскі рух. Пытанне аб «народным» прадстаўніцтве разглядалася ў праграмах усіх галоўных палітычных партый. Палітычная барацьба за дэпутацкія месцы ў Беларусі, у параўнанні з цэнтрам краіны, істотна ўскладнялася ў сувязі са шматнацыянальным і шматканфесійным складам насельніцтва. Акрамя агульнарасійскіх партый, тут дзейнічалі нацыянальныя партыі і групы (яўрэйскія, літоўскія, польскія, беларускія), якія ўваходзілі ў склад розных палітычных лагераў.

Значным фактарам грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця краю быў польскі нацыянальны рух. У ім аформілася дзве плыні – краёвая і эндэцкая. Краёўцы падзяляліся на кансерватыўны і ліберальны накірунак. Сярод 13 польска-беларускіх памешчыкаў і інтэлігенцыі, якія сталі дэпутатамі І Думы, пераважалі кансерватары.

Ад Мінскай губерні ў расійскі «парламент» прайшлі наступныя памешчыкі-палякі:

- Любанскі Яўстафій Іванавіч. Нарадзіўся ў 1859 годзе. Адзін з багацейшых памешчыкаў у заходніх губернях. Валодаў маёнткам пад Мінскам. Член сельскагаспадарчага таварыства, старшыня лясной біржы, гласны Мінскай гарадской думы, вядомы грамадскі дзеяч. З'яўляўся дэлегатам на маскоўскім з'ездзе земскіх і грамадскіх дзеячаў у якасці прадстаўніка ад таварыства сельскай

гаспадаркі. Па палітычных поглядах быў прыхільнікам кадэтаў, хаця і не падзяляў іх падыходы да аграрнай рэформы і да рэформы выбарчай сістэмы.

- Вішнеўскі Ян Янавіч. Землеўладальнік з вышэйшай адукацыяй. Вырашэнне аграрнага пытання лічыў магчымым толькі пасля ўсебаковага высвятлення на месцах органамі мясцовага самакіравання патрэбы ў зямлі. Лічыў, што польскае пытанне неабходна вырашаць у сэнсе прадстаўлення палякам права шырокага мясцовага самакіравання. Належаў да краёўцаў.
- Янчэўскі Віктар Восіпавіч. Гласны Мінскай гарадской думы. У якасці прадстаўніка ад Мінска ўдзельнічаў у земска-гарадскіх з'ездах і выбіраўся членам арганізацыйнага бюро. У Мінску быў надзвычай папулярны, прымаў удзел у працах шматлікіх мясцовых гарадскіх устаноў. У гарадской думе ён вызначыўся як спецыяліст па фінансавых пытаннях. Быў прыхільнікам кадэтаў.
- Лядніцкі Аляксандр Робертавіч. Нарадзіўся ў 1866 годзе. Скончыў Мінскую гімназію, Маскоўскі універсітэт і Дзямідаўскі ліцэй. Узначальваў Маскоўскае рымска-каталіцкае таварыства дабрачыннасці (1896–1917), спрыяў адкрыццю ў Маскве польскіх культурных арганізацый «Лютня», «Сокол», «Польскі дом» і інш. У 1905 г. удзельнічаў у заснаванні канстутацыйна-дэмакратычнай партыі, у 1905–1916 гг. член яе ЦК. Супрацоўнічаў у некалькіх рускіх («Русская мысль», «Русское ведомство», «Русское слово») і польскіх газетах і часопісах. Належаў да ліберальнага кірунку краёвага руху ў Беларусі і Літве. У польскім нацыянальным руху прапаноўваў выставіць на першы план заклікі, якія б адпавядалі інтарэсам беларусаў і літоўцаў. У 1907 годзе выступіў з ініцыятывай утварэння Прагрэсіўнай краёвай партыі, якая б адстойвала інтарэсы ўсяго краю і народаў, што насяляюць яго.

У Дзяржаўнай думе ўсе пералічаныя дэпутаты ўвайшлі ў самастойную тэрытарыяльна-нацыянальную парламенцкую групу – «Тэрытарыяльнае кола» (кіраўнікі: князь І. Э. Друцкі-Любецкі, А. Р. Лядніцкі). Частка прадстаўнікоў кола пры абмеркаванні аграрнага пытання прызнавала неабходнасць частковага адчужэння памешчыцкіх зямель за выкуп, а частка абараняла недатыкальнасць прыватнай уласнасці, што прывяло да іх ізаляцыі ў Думе.



Улічыўшы вопыт выбарчай кампаніі ў І Дзяржаўную думу правыя сілы ў заходніх губернях, пры актыўнай падтрымцы мясцовай адміністрацыі і паліцыі, значна актывізавалі сваю дзейнасць у далейшым. У выніку, дэпутаты-палякі ад г. Мінска і губерні ўцэлым не змаглі прабіцца ў склад дэпутатаў Думы ІІ, ІІІ і ІV скліканняў. Яны былі забалатаваны крайне-правымі, якія заключылі блокі з сялянскімі і гарадскімі выбаршчыкамі і рабілі стаўку на правастаронніх землеўласнікаў.

*Літаратура*


1. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 – 1917 гг.). Мн., 1999. 212 с.
2. Смалянчук А., Лядніцкі Λ. Р. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 4. Мн., 1997.С. 422.


**_А. Вялікі,_**
**_(Мінск)_**

## ПОЛЬСКІЯ ПАМЕШЧЫКІ: ХРОНІКА ЗНІШЧЭННЯ. 1917–1930 гг.

Адным з асноўных дакрэтаў савецкай улады, прынятых пасля кастрычніцкага перавароту 1917 г., з'яўляўся дакрэт аб Зямлі. У адпаведнасці з ім памешчыцкая, манастырская зямля нераходзіла ва ўласнасць дзяржавы і перадавалася сялянству, калектыўным гаспадаркам, ведамствам ды ўстановам. Адмена прыватнай ўласнасці на зямлю азначала, разам з тым, ліквідацыю памешчыкаў як «класа», які варожа ставіўся да савецай улады. У айчыннай гісторыі больш вядома аб працэсе ліквідацыі кулака як класа, што ж датычыць ліквідацыі памешчыка як «класа». то ў беларускай гістарыяграфіі ёсць значны прабел па гэтай праблеме. У сувязі з гэтым цікавасць уяўляе пытанне як праходзіла «ліквідацыя» памешчыкаў як «класа». Мы свядома ўзялі ў коскі слова «клас», бо, на наш погляд, гэта была сацыяльная група грамадства, а не клас, якая займала своеасаблівае месца ў культурным, палітычным, эканамічным жыцці беларускага грамадства.